# 29-га КАСТРЫЧНІКА — 60 ГОД ЛЕНІНСКАМУ КАМСАМОЛУ

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — ДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК І БАЯВЫ РЭЗЕРВ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ПЕРАДАВЫ АТРАД МАЛАДЫХ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да 61-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 29 (308) | Субота, 28 кастрычніка 1978 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




# СЛАЎНАЕ СВЯТА МОЛАДЗІ

Заўтра ўся наша краіна адзначыць знамянальны юбілей — 60-годдзе ВЛКСМ. Ленінскі камсамол, народжаны рэвалюцыйнай бурай, з'яўляецца верным памочнікам і рэзервам Камуністычнай партыі, перадавым атрадам маладых будаўнікоў камунізму.

Увесь сэнс сваёй дзейнасці камсамол бачыць у ажыццяўленні рашэнняў КПСС і Савецкага ўрада, выхаванні моладзі ў духу камуністычных ідэалаў, далучэнні яе да практычнага будаўніцтва новага грамадства, падрыхтоўцы пакалення ўсебакова развітых людзей, якія будуць жыць, працаваць і кіраваць справамі грамадства пры камунізме.

Характэрнай рысай нашага савецкага ладу жыцця з'яўляецца адзінства і пераемнасць усіх пакаленняў савецкіх людзей. У працоўных буднях камсамольцаў 70-х гадоў жывуць і працягваюцца рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Камуністычнай партыі і савецкага народа, якія дапамагаюць нашаму сучасніку зразумець і ацаніць уклад старэйшых пакаленняў у пабудову ў нашай краіне развітога сацыялістычнага грамадства, пранікнуцца той рэвалюцыйнай палкасцю, якая спадарожнічала камсамольскім справам мінулых дзён.

У актыўных радах камсамола змагаецца за выкананне гістарычных рашэнняў партыі і ўрада больш чым чатырохтысячная камсамольская арганізацыя нашага універсітэта — адна з самых буйных на Гомельшчыне. Камсамольцы ГДУ сустракаюць слаўны юбілей новымі поспехамі ў вучобе, навуковых даследаваннях, працы і грамадска-палітычнай дзейнасці.

У кастрычніку прайшлі справаздачна-выбарныя камсамольскія сходы на факультэтах. Яны сталі і аглядам баявітасці камсамольскіх арганізацый, паказалі ўзросшы ўзровень іх прынцыповасці і ініцыятыўнасці ў барацьбе за паляпшэнне якасці ведаў студэнтаў і навыкаў арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы ў калектыве. У ходзе справаздач і выбараў акрэслена праявіліся жаданне камсамольцаў быць заўсёды на пярэднім краі падзей, уменне крытычна ацэньваць дасягнутыя поспехі, ставіць захапляльныя перспектывы развіцця калектываў, выбіраць з усёй разнастайнасці спраў найбольш актуальныя, вырашаць пытанні ўдасканальвання камсамольскай работы, зыходзячы з дзяржаўных інтарэсаў.

Камсамольская арганізацыя універсітэта па праву ганарыцца сваімі выдатнікамі вучобы і актывістамі, сярод якіх ленінскія стыпендыяты Сяргей Каморнікаў, Сяргей Мяльноў, Міхаіл Абраменка, дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў Людміла Краснагір, ветэран студэнцкага будаўнічага руху Ірына Гаробчанка і многія іншыя.

Шырокі размах ва універсітэце набыла навукова-даследчая работа студэнтаў. У мінулым навучальным годзе ва Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» удзельнічала 1768 нашых студэнтаў, а ў I туры Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх дысцыплінах, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху — 3895 будучых спецыялістаў.

Прызнанай формай работы па прыцягненню кожнага камсамольца да актыўнай, свядомай, творчай дзейнасці ў ВНУ і па-за яго сценамі, выхавання ў моладзі патрэб самастойнага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі, павышэння працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці стаў Ленінскі залік, які як бы падсумоўвае асноўныя напрамкі дзейнасці вузаўскага камсамола, пашырае рамкі і магчымасці ўздзеяння арганізацыі на кожнага камсамольца.

Юнакі і дзяўчаты універсітэта прымаюць актыўны ўдзел ва Усесаюзным агітпаходзе студэнцкай моладзі «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» — масавым патрыятычным руху, накіраваным на правядзенне разнастайнай агітацыйна-прапагандысцкай, культурна-масавай і шэфскай работы сярод насельніцтва. У ходзе II этапа гэтага агітпахода агітбрыгады ГДУ зрабілі паездкі ў Лельчыцкі, Рагачоўскі, Чачэрскі, Лоеўскі і Нараўлянскі раёны. Асабліва актыўна ўдзельнічалі ва Усесаюзным агітпаходзе студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта.

Важнейшай праблемай дня для камсамольскай арганізацыі універсітэта цяпер з'яўляецца далейшае арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне ўсіх яе звенняў, паслядоўнае ажыццяўленне прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізму, паляпшэнне падбору, расстаноўкі і выхавання актыву, зацвярджэнне ленінскага стылю ў рабоце.

Напярэдадні слаўнага 60-годдзя Ленінскага камсамола камітэт ЛКСМБ ГДУ выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тое, што камсамольская арганізацыя універсітэта мабілізуе ўсе наяўныя рэзервы, праявіць максімум арганізаванасці і дзелавітасці, каб паспяхова выконваць пастаўленыя перад ёю задачы.

Ад імя камітэта камсамола горача віншую ўсіх студэнтаў універсітэта з 60-годдзем ВЛКСМ. Вялікіх вам поспехаў і здзяйсненняў, невычарпальнай энергіі і рамантыкі, новых перамог у імя шчасця і росквіту нашай любімай Радзімы!

**М. БЕРАЗОЎСКАЯ,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ.**

# ЮНОСТЬ МОЯ, КОМСОМОЛ!

I.

Героев прошлых лет достойнейшая смена
На поприще труда и в пламени борьбы,
Вершитель славных дел, мечтою вдохновенный,
Ты славен комсомол, кузнец своей судьбы!
В те дни, когда ещё пылал огонь сражений,
Ты в первых был рядах, с отцами наравне, —
В тачанке, у руля, на взмыленном коне,
Преемственность храня веков и поколений.
В степи, на целине, на стройке, на заводе,
На поле, где, резвясь, колышет ветер рожь,—
На поприще любом к любому делу ты пригоден,
Как юность вечная, на свете ты живешь.

II.

Промчались годы, пахнущие дымом,
Мир обретен, украсив труд людей,
Героев жизнь горит неугасимо
В сердцах горячих пламенем идей.
По Ленину свои мы мерим жизни
И по нему сверяем жар сердец.
Сегодня сын умножит мощь Отчизны,
Как раньше умножал ее отец.
Мы пишем в биографию державы
Всё новые страницы каждый год,
И славными успехами по праву
В труде, во всем гордится наш народ.
И если спросят нас, кто мы такие, —
Ответит каждый, гордость не тая:
Строители державы молодые,
Наследники и дети Октября.

Людмила ДЕМИДЕНКО, студентка 2-го курса историко-филологического факультета.

# НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВНУ

**Вышэйшая школа Беларусі дзякуючы пастаянным клопатам партыі і ўрада развіваецца інтэнсіўна і гарманічна. Разам з Акадэміяй навук і галіновымі інстытутамі ВНУ цяпер маюць значны навуковы патэнцыял. Правільнае яго выкарыстанне і развіццё — задача вялікай дзяржаўнай важнасці.**

Навуковы патэнцыял — гэта кадры, матэрыяльная база, фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вышэйшых навучальных устаноў. А іх сёння ў рэспубліцы 31. Па двухстах розных спецыяльнасцях вучацца 168 тысяч студэнтаў. На кафедрах ВНУ працуюць 12 тысяч высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Амаль палавіна іх маюць вучоныя ступені і званні. У іх ёсць магчымасць павышаць сваю кваліфікацыю ў перадавых навуковых і вытворчых арганізацыях. У вышэйшых навучальных установах паспяхова дзейнічаюць навукова-даследчыя інстытуты, праблемныя і галіновыя лабараторыі, канструктарскія бюро, дзе плённа працуюць тысячы даследчыкаў. Многія ВНУ ужо сталі сапраўды буйнымі навучальна-навуковымі цэнтрамі. Сярод іх — Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, Мінскі медыцынскі, Беларускі тэхналагічны, Мінскі радыётэхнічны інстытуты і іншыя. Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і Беларускі політэхнічны інстытут аднесены да ліку вядучых ВНУ краіны.

Навуковы патэнцыял ВНУ мае свае асаблівасці. Наяўнасць на кафедрах спецыялістаў многіх профіляў робіць яго вельмі living рознабаковым, а перыядычны прыток студэнцкай моладзі — дынамічным. Важна і тое, што навуковы патэнцыял ВНУ пастаянна ўзбагачае народную гаспадарку, бо ў яе штогод уліваюцца маладыя спецыялісты з багажом новых ідэй і ведаў, якія яны набылі ў інстытутах. Цяпер, напрыклад, амаль кожны чацвёрты работнік, заняты ў народнай гаспадарцы рэспублікі, мае вышэйшую ці сярэднюю спецыяльную адукацыю.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

